**І. А. Алексніна,** *дацэнт кафедры тэатральнай творчасці, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт*

# АСАБЛІВАСЦІ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ-ЗАВОЧНІКАЎ КАФЕДРЫ ТЭАТРАЛЬНАЙ ТВОРЧАСЦІ НАД ПАСТАНОЎКАЙ ДЫПЛОМНАГА СПЕКТАКЛЯ

У адрозненні ад дыпломнікаў дзённай формы навучання выпускнікі кафедры тэатральнай творчасці факультэта завочнага навучання практычна ўсе працуюць па абранай спецыяльнасці. Яны, у большасці, маюць прафесійны стаж, добра ведаюць матэрыяльныя і фінансавыя магчымасці сваіх тэатральных калектываў, творчыя даныя акцёраў, мастацкія запатрабаванні і густ глядацкай аўдыторыі. Таму дыпломныя спектаклі выпускнікоў факультэта завочнага навучання звычайна адрозніваюцца высокім пастановачным узроўнем.

Найбольшыя складанасці ў працэсе напісання дыпломных работ студэнтамі-завочнікамі ўзнікаюць менавіта ў працэсе стварэння рэжысёрскай задумы спектакля. Таму ў дадзеным артыкуле звернем асаблівую ўвагу менавіта на працэс стварэння рэжысёрскай задумы дыпломнага спектакля студэнтамі факультэта завочнага навучання.

Як паказвае пятнаццацігадовы вопыт кіраўніцтва дыпломнымі працамі, працэс работы над стварэннем рэжысёрскай задумы спектакля звязаны з узроўнем складанасці драматургічнага матэрыялу: будзе гэта невялікая казачка для дзяцей малодшага школьнага ўзросту ці п’еса з класічнай сусветнай драматургіі. Тым не менш пры стварэнні рэжысёрскай задумы спектакля ёсць шмат агульных аспектаў, на якіх спынімся ў дадзеным артыкуле больш падрабязна.

Стварэнне рэжысёрскай задумы любога, у тым ліку і дыпломнага, спектакля студэнтам-завочнікам пачынаецца з ідэйна-тэматычнага вытлумачэння (інтэрпрэтацыі) п’есы: тэма, ідэя, звышзадача будучага спектакля, яго стыль і жанр, кампазіцыя, фабула, падзейны рад, прапанаваныя абставіны, асноўныя і другарадныя канфлікты і іх носьбіты, вывучаецца аўтарская характарыстыка дзеючых асоб. На аснове апошняй рэжысёр распрацоўвае характарыстыку асобных персанажаў будучага спектакля, якую пазней удасканальвае і развівае сумесна з акцёрам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У працэсе інтэрпрэтацыі п’есы рэжысёрам вызначаецца асноўная тэма будучага спектакля. Звычайна драматычны твор закранае некалькі значных тэм, праблем. Вельмі важным на дадзеным этапе работы з матэрыялам з’яўляецца вызначэнне пэўнай тэмы спектакля, якая (у адрозненне ад ідэі) заўсёды канкрэтная. Яна ўяўляе сабой адлюстраванне аб’екта або з’явы рэчаіснасці, якія знайшлі адлюстраванне ў дадзенай п’есе і будучым спектаклі. Далей вызначаецца ідэя спектакля – адлюстраванне пачуццяў і думак у адносінах да аб’екта або з’явы рэчаіснасці, адлюстраваных у драматычным творы. Ідэі, у адрозненне ад тэмы, уласцівы больш абстрактны характар, калі-нікалі яна фармулюецца ў выглядзе прыказкі («Не ўсё кату Масленіца», «Не капай іншаму яму» і інш.).

Спрэчкі аб тым, ці патрэбна вызначаць звышзадачу аўтара ў час аналізу п’есы і ў працэсе стварэння рэжысёрскай задумы, і да гэтага часу не сціхаюць у тэатральна-педагагічных колах. Зразумела, што часта мы не можам дакладна акрэсліць звышзадачу аўтара, тым больш калі працуем з творамі сусветнай класікі (Мальер, Шэкспір, Чэхаў і інш.). Тым не менш вызначэнне звышзадачы спектакля ў сучасным тэатральным мастацтве з’яўляецца вельмі значным этапам і па той прычыне, што аказвае вялікі ўплыў на ўвесь далейшы творчы працэс. Менавіта пры вызначэнні звышзадачы аўтара мы паказваем актыўную грамадзянска-творчую пазіцыю стваральніка спектакля – рэжысёра (высмеяць, падкрэсліць, разбіць, развянчаць, сфарміраваць і інш.). Менавіта з гэтага моманту і выяўляюцца эмацыянальныя адносіны рэжысёра (як аўтара спектакля) да аб’екта (або з’явы) рэчаіснасці, якая знайшла адлюстраванне ў дадзеным сцэнічным творы. А гэта дазваляе вызначыць жанр і стыль спектакля. У залежнасці ад эмацыянальных адносін рэжысёра да рэчаіснасці, адлюстраванай у п’есе, аўтарскі жанр можа мяняцца на амаль што супрацьлеглы. Напрыклад, сацыяльную драму А. Астроўскага «Беспасажніца» рэжысёр можа ставіць як камедыю характараў, а камедыю А. П. Чэхава «Чайка» – як сацыяльную драму.

Сцэнічны жанр будучага спектакля раскрываецца праз рэалізацыю рэжысёрскіх эмацыянальных адносін да падзей, якія адбываюцца ў спектаклі, праз шэраг асноўных складнікаў спектакля: ігру акцёраў, сцэнаграфію, прасторавае, музычна-шумавое і тэмпарытмічнае рашэнне спектакля. Значную падказку да раскрыцця жанравай прыроды п’есы дае скрупулёзнае вывучэнне аўтарскіх рэмарак п’есы. Пры стварэнні жанру

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

спектакля маюць значэнне мера ўмоўнасці (суадносіны канкрэтнага і абстрактнага), гісторыка-бытавая і агульная дакладнасць, тып канфлікту (камедыйны ці трагедыйны), спосабы работы над сцэнічнымі вобразамі, прынцыпы ўзаемадзеяння з глядзельнай залай, пабудова мізансцэн, пратораваe і гукавое рашэнне спектакля. Не менш важным з’яўляецца праяўленне адзінства жанру ва ўсіх кампанентах спектакля: ад выканальніцкіх да прасторава-музычных.

Жанр будучага спектакля студэнта-дыпломніка непарыўна звязаны са стылем п’есы. Пад тэрмінам «стыль» у тэатральнай педагогіцы прынята разумець сукупнасць ідэйна-мастацкіх асаблівасцей творчасці аўтара (драматурга або рэжысёра). У нашым выпадку гэта рэжысёр спектакля. Пры стварэнні стылістыкі спектакля значную ролю адыгрываюць вывучэнне стылістыкі драматурга шляхам вывучэння яго іншых твораў, вызначэнне характэрных для пісьменніка светапогляду і спосабаў іх адлюстравання ў творы, выяўленне індывідуальнай манеры аўтарскага пісьма. Стыль Горкага будзе моцна адрознівацца ад стылю Гогаля, Чэхава, Галубка і інш. Таму студэнту-завочніку – пастаноўшчыку дыпломнага спектакля – неабходна вывучыць не толькі творчую дзейнасць драматурга, але і звярнуць увагу на грамадска-гістарычныя ўмовы яго жыцця, факты творчай біяграфіі.

Наступным значным крокам у стварэнні рэжысёрскай задумы спектакля студэнта-завочніка з’яўляецца вызначэнне кампазіцыйнай будовы спектакля. Трэба заўважыць, што кампазіцыя за ўвесь час існавання драматургіі пацярпела значныя змены, страціла некаторыя структурныя элементы (пераважна гэта пралог і эпілог), сёння залежыць ад «кліпавага» светаўспрымання сучаснага гледача. Пры рабоце над кампазіцыяй спектакля студэнту-завочніку неабходна ўлічваць асноўныя падзеі спектакля, расстаноўку сіл па скразным і контрскразным дзеяннях, рэжысёрскія акцэнты, ацэнкі тых ці іншых падзей, асноўных момантаў развіцця спектакля, тэмп і рытм спектакля. У рабоце над кампазіцыяй дыпломнага спектакля неабходна ўлічваць таксама і жанрава-стылістычныя асаблівасці п’есы, асаблівасці развіцця канфліктаў, спецыфіку ўспрымання спектакля сучасным гледачом.

Падзейны рад п’есы і спектакля звычайна вызначаецца па прынцыпе выключэння: калі падзея не з’яўляецца ключавой, то яе выключэнне не прывядзе да буйных змен у развіцці сюжэта сцэнічнага твора. Пры стварэнні рэжысёрскай задумы спектакля,

РЭПОЗІТОРИЙ БГУКИ

пераважна ў выпадку пастаноўкі рэалістычнай п’есы, мэтазгодным будзе выкарыстанне схемы вызначэння падзейнага рада, прапанаванага Г.А.Таўстаногавым (СПб., 2003), апісанага ў рабоце І.Б. Малачэўскай «Режиссёрская школа Г. А. Товстоногова»: зыходная падзея, асноўная падзея, цэнтральная падзея, фінальная і галоўная падзеі.

Работа над вызначэннем прапанаваных абставін будучага спектакля таксама дастаткова працаёмкі працэс. Ён уключае ў сябе вывучэнне фабулы п’есы, яе фактаў, падзей, месца і часу дзеяння, мізансцэніраванне, сцэнаграфічнае і музычна-шумавое рашэнні. На наш погляд, многія рэжысёры недастаткова ўважліва адносяцца да гледача, які на самой справе з’яўляецца вельмі важным сутворцам спектакля. Ужо пры стварэнні задумы таго ці іншага спектакля рэжысёру неабходна ўлічваць ступень падрыхтаванасці глядзельнай залы да ўспрыняцця спектакля.

Тэатр – мастацтва часава-прасторавае, якое адбываецца «тут, сёння, зараз», таму пры стварэнні рэжысёрскай задумы дыпломнага спектакля значную ўвагу рэжысёрам-дыпломнікам неабходна надаваць сцэнаграфіі спектакля і яго музычна-шумавому рашэнню, якія павінны дыктавацца ідэйна-тэматычнай трактоўкай сцэнічнага матэрыялу, жанрам і стылем драматургіі, тыпам пабудовы канфлікту і сцэнічнай формы ўвасаблення спектакля. Пры гэтым маладому рэжысёру неабходна памятаць аб вядучай ролі скразнога дзеяння і звышзадачы ў цэласнасці спектакля і падпарадкаванні ўсіх яго элементаў.

Такім чынам, падводзячы вынікі, хацелася б падкрэсліць, што, перш чым пачынаць працу непасрэдна з выканаўцамі, рэжысёр-дыпломнік – выпускнік факультэта завочнага навучання – павінен правесці вялікую падрыхтоўчую работу: зрабіць інтэрпрэтацыю п’есы, даць характарыстыку дзеючым асобам, намеціць рашэнне спектакля ў прасторы і часе (характар мізансцэн і планіровак, тэмпарытм спектакля), вызначыць характар і асноўныя прынцыпы музычна-шумавога і дэкарацыйна-мастацкага рашэння спектакля.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ